# Гісторыя

*У.К.КОРШУК*

## БСГ І ПРАБЛЕМЫ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ БЕЛАРУСІ

Сучасная Беларусь набыла статус незалежнай суверэннай дзяржавы ў выніку працяглага складанага і супярэчлівага гістарычнага развіцця. Гэта быў шлях вастрэйшых сацыяльных сутыкненняў і ўзрушэнняў, выкліканых рэвалюцыямі, войнамі, панаваннем рэжыму дэспатычнага аўтарытарызму.

На працягу многіх гадоў гэты неадназначны працэс трактаваўся аднабакова, без уліку ўсёй сукупнасці гістарычных фактаў, якія толькі адны могуць быць аб'ектыўнай асновай для дакладных высноў. Што тычыцца ідэй і праграмных установак па пытаннях нацыянальна-дзяржаўнага ладу палітычных партый, што супрацьстаялі камуністычнай партыі, спроб рэалізацыі іх дзяржаўных установак самастойна ці ў згодзе з камуністамі, то яны або замоўчваліся, ці тлумачыліся выключна негатыўна.

Між тым праграмы розных партый, што дзейнічалі на Беларусі, змяшчалі шмат канкрэтных ідэй па праблемах нацыянальна-дзяржаўнага ладу, некаторыя з іх актуальныя і цяпер.

Разгледзім у гэтым аспекце найбольш вядомую з іх – Беларускую сацыялістычную грамаду (БСГ). Яна была ўтворана ў 1902 г. на падставе нацыянальна-культурных гурткоў беларускай моладзі; аб'ядноўвала інтэлігенцыю, шляхту, сялянства, уваходзілі ў яе арганізацыю і рабочыя. У снежні 1903 г. першы з'езд Грамады абвясціў яе партыяй беларускага працоўнага народа сацыялістычнай арыентацыі. Было вырашана дабівацца для Беларусі краёвай аўтаноміі з соймам у Вільні і гарантаванай культурна-нацыянальнай аўтаноміі для нацыянальных меншасцей[1]. Пры гэтым БСГ не ўлічвала прынцыповых адрозненняў паміж пралетарыятам і сялянствам, іншымі пластамі працоўных, аб'ядноўваючы іх у адну сацыяльна-эканамічную катэгорыю – працоўны народ. Прыкламуючы прызнанне класавай барацьбы, БСГ у той жа час фактычна не заўважала яе сярод беларусаў. Партыя называла сябе арганізацыяй беларускага працоўнага народа. І ўсё ж у пачатку дзейнасці БСГ яе заклікі вызваліцца ў саюзе з пралетарыятам Расіі ад рускага самадзяржаўнага і панскага эканамічнага прыгнёту атрымалі распаўсюджванне і падтрымку нават у самых глухіх месцах Беларусі.

Партыя выстаўляла агульнадэмакратычныя патрабаванні: усеагульнае, прамое, роўнае выбарчае права; тайнае галасаванне пры выбарах; аднолькавыя правы і культурна-нацыянальная аўтаномія для ўсіх народнасцей, якія жывуць на адной тэрыторыі; раўнапраўе ўсіх грамадзян незалежна ад полу, рэлігіі, нацыянальнасці і расы; скасаванне саслоўяў; выбарнасць чыноўнікаў і суддзяў; свабода сумлення, слова, друку, сходаў, саюзаў, стачак і забастовак; недатыкальнасць асобы і жылля; бясплатная абавязковая адукацыя для ўсіх; ліквідацыя ўсялякіх ускосных падаткаў і ўстанаўленне прагрэсіўнага падатку на даходы і спадчыну.

Пасля Лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. БСГ актыўна ўключылася ў барацьбу за сацыяльную справядлівасць і нацыянальныя правы беларускага народа. Пры гэтым яна практычна цалкам падтрымала палітыку абарончніцтва Часовага ўрада і вітала насуперак сваёй папярэдняй праграме стварэнне беларускай народ-

най арміі, спадзяючыся, што яна дапаможа беларускаму народу дамагчыся яго нацыянальных і сацыяльных мэт[2]. У абставінах палітычнай эйфарыі пасля звяржэння самадзяржаўя актывізавалася стварэнне разнастайных партый і іншых грамадскіх фарміраванняў. У гэты час БСГ пакінулі прадстаўнікі буржуазна-ліберальных плыняў, якія аб'ядналіся ў такія палітычныя арганізацыі, як Беларуская хрысціянская дэмакратыя, Беларуская партыя народных сацыялістаў і інш. З'яўляючыся партыяй нацыянальнай дэмакратыі, БСГ ў кааліцыі з іншымі нацыянальнымі арганізацыямі і партыямі выказала патрабаванне дзяржаўнай аўтаноміі Беларусі ў складзе Расіі[3].

Такім чынам, БСГ не выстаўляла патрабавання поўнай незалежнасці Беларусі ад Расіі. У звароце да беларускай інтэлігенцыі адзін з вядомых дзеячоў Грамады С.Рак-Міхайлоўскі падкрэсліваў: "...Аб ніякім аддзелу ад Расіі і гутаркі быць ня можа, ніхто гэтага і дабівацца ня будзе і ніколі народ гэтага не захоча, бо мы звязаны з усёй Расіяй і ў гандлю, і ў промыслах, і ва ўсім гаспадарскім жыцці дзяржавы, і мы будзем разам з усёй Расіяй крапчэй, мацней, чым аддзяліўшыся... Мы толькі хочам, каб было тут, у нас, краёвае самапарадкаванне з сваіх выбарных мясцовых людзей, свае выбарныя чыноўнікі і вучыцелі, суд і школа ў роднай мове..."[4].

Аднак былі і грамадоўцы, якія патрабавалі поўнай незалежнасці Беларусі, іншыя ж дамагаліся ўтварэння разам з палякамі і літоўцамі незалежнай Беларуска-Літоўскай дзяржавы ў выглядзе канфедэрацыі Вялікага княства Літоўскага. Пры гэтым прапаноўвалася ўнутранае размежаванне беларускіх і літоўскіх зямель паводле матчынай мовы жыхароў[5]. Але гэтая ідэя не атрымала шырокага распаўсюджвання з-за супярэчнасцей паміж яе прыхільнікамі. Палякі імкнуліся паланізаваць беларусаў, а літоўцы шукалі сепаратнага пагаднення з немцамі аб стварэнні асобнай літоўскай дзяржавы, у якую былі б уключаны і беларускія землі.

У сакавіку 1917 г. на з'ездзе прадстаўнікоў беларускіх нацыянальных арганізацый быў створаны Беларускі нацыянальны камітэт (БНК), які абвяшчаўся вышэйшым органам дзяржаўнай улады краіны да выбараў у Цэнтральную Раду. У склад БНК было выбрана 18 чалавек. Большасць з іх (10) належала да БСГ, аднак асноўны напрамак дзейнасці камітэта вызначала яго кіруючая група, агульнапалітычныя погляды якой абмяжоўваліся праграмай кадэтаў. У сувязі з гэтым БНК не карыстаўся папулярнасцю ў працоўных.

Культурна-нацыянальнае і палітычнае адраджэнне беларускага народа БНК меркаваў ажыццявіць шляхам стварэння Беларускай аўтаноміі ў складзе Расійскай Дэмакратычнай Федэратыўнай Рэспублікі. Камітэт перасцерагаў грамадзян краіны ад тых людзей, якія, прыкрываючыся імем беларускім, вялі прапаганду за далучэнне да Польшчы або якой іншай дзяржавы. БНК склікаў сялянскі і настаўніцкія з'езды, уступіў у перагаворы з Часовым урадам аб прызнанні аўтаноміі Беларусі. Аднак Часовы ўрад адмовіўся прыняць прадстаўнікоў Беларусі.

Праціўнікамі беларускага нацыянальнага адраджэння выказалі сябе расійскія эсэры, кадэты, правыя чарнасоценныя элементы, сацыял-дэмакраты і іншыя партыі, у тым ліку і тыя, хто прыкрываўся беларускімі назвамі: "Саюз беларускай дэмакратыі" у Гомелі, "Беларускі нацыянальны камітэт" у Магілёве, "Саюз беларускага народа" у Віцебску.

У такіх абставінах БСГ атрымлівае ўсё большую народную падтрымку. Мацнеюць яе арганізацыі ў Петраградзе, Маскве, Саратаве, на Украіне, у Сібіры, ва ўсіх расійскіх гарадах, дзе жылі беларусы. Арганізацыі БСГ ствараюцца ў часцях Заходняга і Паўночнага франтоў. Непасрэдна ў Беларусі колькасць радоў БСГ да восені 1917 г. узрасла да 10 тыс. чалавек. Усё гэта сведчыла аб росце нацыянальнай самасвядомасці, імкненні беларускага народа да афіцыйнага прызнання яго раўнапраўя з іншымі народамі.

У кастрычніку 1917 г. у Мінску адбыўся III з'езд БСГ, які пацвердзіў стратэгічную мэту партыі – ажыццяўленне сацыялістычнага ладу праз развіццё міжнароднай класавай барацьбы і сацыяльнай рэвалюцыі. Аднак канкрэтныя палажэнні прынятай з'ездам Праграмы не выходзілі за межы буржуазна-дэмакратычных патрабаванняў рэфарміравання існаваўшага ладу.

Палітычны раздзел новай праграмы ў многім паўтарыў яе стары варыянт. Але з'явіліся і некаторыя новыя палажэнні: патрабаванне права народнай зака-

надаўчай ініцыятывы, правядзення рэферэндумаў для вырашэння найбольш важных пытанняў. Будучая Расія як федэратыўная рэспубліка, па ўяўленні кіраўніцтва БСГ, павінна ажыццявіць тэрытарыяльную і персанальную аўтаномію для ўсіх яе нацыянальнасцей[6]. Выступаючы за дэцэнтралізацыю ўлады, партыя прапаноўвала прадаставіць аўтаномію абласцям і абшчынам, якія вызначаюцца эканамічнымі і бытавымі ўмовамі. Паляпшэнню якаснага складу мясцовай адміністрацыі павінна была садзейнічаць яе выбарнасць, адказнасць перад судом і змяняльнасць па патрабаванні народа. Праграма БСГ прадугледжвала аддзяленне царквы ад дзяржавы, свецкае навучанне ў школах, адносячы рэлігію да асабістай справы кожнага чалавека. У сферы знешнепалітычных адносін партыя лічыла неабходным стварэнне міжнароднага суда для вырашэння спрэчак паміж дзяржавамі.

У сферы дзяржаўнага ўладкавання партыя выступала за поўнае самакіраванне (аўтаномію) Беларусі з заканадаўчым органам – Краёвай Радай, абранай на аснове ўсеагульнага, роўнага, прамога, тайнага і прапарцыянальнага выбарчага права; недапушчэнне таможных граніц паміж Беларуссю і іншымі часткамі Расійскай Федэрацыі, за поўнае палітычнае і эканамічнае раўнапраўе ўсіх нацыянальнасцей на тэрыторыі Беларусі.

Летам і восенню 1917 г. лідэры БСГ спрабуюць устанавіць на Беларусі ўласную ўладу. У жніўні 1917 г. непапулярны Беларускі нацыянальны камітэт быў скасаваны, а замест яго была ўтворана Цэнтральная беларуская Рада (ЦБР), якую ў канцы кастрычніка 1917 г. перайменавалі ў Вялікую беларускую Раду (ВБР).

Вялікая Рада разам з Цэнтральнай беларускай вайсковай радай (ЦБВР) назначыла правядзенне ў снежні 1917 г. Усебеларускага з'езда для вырашэння пытання "Аб краявой уладзе". Гэтую ідэю падтрымаў Беларускі абласны камітэт (БАК), які асталяваўся ў Петраградзе. На снежаньскі з'езд прыбылі 1872 дэлегаты ад БСГ, эсэраў, меншавікоў, бальшавікоў. У якасці запрошаных прысутнічалі прадстаўнікі гарадскіх дум, земстваў, афіцэраў і салдат, сялян, рабочых, настаўнікаў, урачоў і г.д. Шматпартыйнасць складу з'езда натуральна адбілася на ходзе дыскусій.

Бальшавікі недаацэньвалі важнасць нацыянальнага руху на Беларусі і выступілі супраць стварэння Беларускай дзяржавы, быўшы перакананымі, што ў парадку дня стаіць сусветная рэвалюцыя, стварэнне сусветнай савецкай рэспублікі, а не дзяржаўнасць асобных рэгіёнаў Расіі.

Аднак ВБР, прызнаўшы ўладу беларускіх Саветаў сялянскіх, салдацкіх і рабочых дэпутатаў, выступала за стварэнне самастойнай рэспублікі ў рамках Расійскай Федэрацыі. З'езд, абвясціўшы права Беларусі на самавызначэнне і ўстанаўленне рэспубліканскага ладу, пастанавіў утварыць часовы выканаўчы орган улады.

Але тады бальшавіцкія ўлады аб'явілі з'езд незаконным і распушчаным, што выклікала рэзкі раскол у беларускім нацыянальным руху. Узмацнілася сепаратысцкае "правае крыло" БСГ, якое выступіла супраць устанаўлення Савецкай улады на Беларусі. "Левае крыло" аддавала прыярытэт рашэнню рэвалюцыйных інтэрнацыянальных задач над нацыянальнымі. Раскол БСГ яскрава адбіўся на ходзе і рашэннях III з'езда. Левая плынь, прадстаўленая Петраградскай, Маскоўскай і Бабруйскай арганізацыямі, хаця фармальна не выйшла з саставу партыі, але не падпарадкоўвалася ЦК. Кіруючым цэнтрам "левых" стаў Петраградскі камітэт БСГ.

Імкненне да здабывання незалежнасці ў беларускім вызваленчым руху асабліва ўзмацніліся пасля падпісання 3 сакавіка 1918 г. Брэсцкага мірнага дагавору, калі лёс Беларусі быў вырашаны без удзелу яе прадстаўнікоў. У гэтых умовах Выканаўчы камітэт рады Усебеларускага з'езда 9 сакавіка абвясціў Беларусь Народнай Рэспублікай. Уся паўната ўлады перадавалася Радзе Беларускай Народнай Рэспублікі. Супраць абвяшчэння незалежнасці выступілі прадстаўнікі шэрагу польскіх, рускіх і яўрэйскіх арганізацый на Беларусі. У апазіцыі да Рады аказаліся і члены "Мінскага беларускага прадстаўніцтва" – прыхільнікі беларуска-германскага збліжэння.

Пасля заканчэння дэбатаў кіраўніцтва Рады заявіла, што будучыню Беларусі яно бачыць толькі пад апекай Германіі і ў саюзе з ёй. У прывітальнай тэлеграме

да кайзера Вільгельма Рада выказвала глыбокую падзяку нямецкім войскам за вызваленне ад чужога прыгнёту, насілля і анархіі. Дэкларуючы незалежнасць і непадзельнасць Беларусі, Рада прасіла падтрымаць яе дзейнасць для ўмацавання дзяржаўнай незалежнасці і непадзельнасці краю. Паколькі гэты зварот Рады прымаўся ўпотай, на яе закрытым пасяджэнні, то атрымаўшы звесткі аб ім, левае крыло Грамады адклікае сваіх прадстаўнікоў з урада, што значна аслабіла ўладарныя пазіцыі партыі.

У 1918 г. супярэчлівасці, трэнні ў радах БСГ прывялі да яе распаду на тры палітычныя партыі: дзве – сацыял-дэмакратычнага накірунку (Беларуская партыя сацыялістаў-федэралістаў і Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя) і партыя народніцкага напрамку (Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў).

Размежаванне ў радах БСГ аслабіла яе папулярнасць. Аднак нельга згадзіцца са сцвярджэннем аўтараў дадатка да 24 тома поўнага збору твораў У.І.Леніна, што БСГ, з'яўляючыся нацыяналістычнай арганізацыяй, "адстойвала інтарэсы беларускай буржуазіі, памешчыкаў і кулакоў... імкнулася адарваць, адасобіць беларускі народ ад рускага рэвалюцыйнага рабочага класа"[7]. Няма нічога заганнага ў тым, што БСГ выступала за адраджэнне беларускай нацыі, развіццё яе мовы і культуры, за тое, каб была беларуская дзяржаўнасць, заснаваная на прынцыпах прававой дзяржавы, талерантнасці ў адносінах да меншасцей, дзе б умацоўвалася ўлада народа, не дапускалася эксплуатацыя чалавека чалавекам. Яе палітыка, практычныя дзеянні былі накіраваны на змяненне грамадскіх адносін, хай мірным, рэфармісцкім шляхам, але ўсё ж змяненне ў інтарэсах беларускага народа. Да таго ж значная частка лідэраў БСГ, прыхільнікаў незалежнасці Беларусі, была супраць адрыву рэспублікі ад Расіі. Па сутнасці, гэта быў сацыял-дэмакратычны кірунак у беларускім нацыянальна-вызваленчым руху. Іншая справа, што, дэкларуючы агульныя мэты, БСГ не заўсёды ўяўляла сабе, як іх рэалізоўваць. Але тым не менш у планах і дзейнасці Грамады адсутнічалі намеры забяспечыць працвітанне беларусаў за кошт іншых народаў. Абуджэнне нацыянальнай самасвядомасці народа, адраджэнне мовы і культуры, імкненне да стварэння беларускай дзяржаўнасці – вось што вызначала дзейнасць БСГ.

Нельга згадзіцца і з другім сцвярджэннем названай публікацыі аб тым, што "пасля Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі Беларуская Грамада распалася на шэраг контррэвалюцыйных груп, якія вялі актыўную барацьбу супраць Савецкай улада"[8]. З БСГ сапраўды вылучылася некалькі партый. Па-рознаму паводзілі яны сябе ў адносінах да Савецкай улады, але не ўсе выступалі супраць. Так, частка яе левага крыла на чале з А.Чарвяковым стварыла Беларускую сацыял-дэмакратычную партыю, якая ў лютым 1918 г. разам з Петраградскай арганізацыяй БСГ афармілася ў Беларускі нацыянальны камісарыят. Белнацкам праіснаваў да сакавіка 1919 г. Ён вёў актыўную палітычную і культурна-асветную работу сярод беларусаў на тэрыторыі Савецкай Расіі, удзельнічаў у падрыхтоўцы ўтварэння БССР. Другая частка "левых" БСГ на чале з Д.Жылуновічам таксама падтрымлівала Савецкую ўладу.

У студзені 1919 г. Д.Жылуновіч узначаліў Часовы ўрад Савецкай Беларусі. У ліку пяці членаў Часовага рабоча-сялянскага ўрада А.Чарвякоў падпісваў маніфест аб абвяшчэнні БССР.

Аналіз дзейнасці Грамады паказвае, што яе прыхільнікі стаялі на патрыятычных пазіцыях, былі перш за ўсё зацікаўлены лёсам Беларусі, яе сучасным і будучым. І рабілі гэта не насуперак інтарэсам другіх народаў, што жылі на тэрыторыі Беларусі.

[1] Гл.: Программа Белорусской Социалистической Громады // Праграмныя дакументы палітычных партый. Мн., 1994. С.4.

[2] Там жа. С.5.

[3] Там жа. С.9.

[4] Рак-Міхайлоўскі С. Да беларускай інтэлігенцыі вясковых вучыцеляў // Вольная Беларусь. 1917. 17 жніўня.

[5] БДАМЛМ. Ф.3, воп.1, спр.139, арк.15.

[6] Программа Белорусской Социалистической Громады. С.7.

[7] Ленин В.И. Полн. собр. соч. Т.24. С.465.

[8] Там жа.